

# Ватацы
## Ніна Барысаўна
(нар. 1 [14] мая 1908 г.)

Член КПСС з 1945 г., галоўны бібліёграф аддзела беларускай літаратуры і бібліяграфіі. У бібліятэцы працуе з 1930 года.

Ніна Барысаўна - заснавальнік бібліяграфіі беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, аўтар буйных бібліяграфічных прац, шырока вядомых па-за межамі рэспублікі, даследчык беларускай літаратуры. Яна знайшла і апублікавала невядомыя тэксты М. Багдановіча і рукапісны зборнік яго вершаў. Апрача работы ў бібліятэцы, Ніна Барысаўна шмат гадоў аддала выхаванню бібліятэчных кадраў, працуючы выкладчыкам бібліятэчнага факультэта Мінскага педінстытута. Усё яе жыццё і дзейнасць - прыклад высокай сумленнасці і адданасці сваёй любімай справе.

За шматгадовую працу і заслугі ў развіцці бібліятэчнай справы ў рэспубліцы Н.Б. Ватацы ўзнагароджана медалямі „За доблестный труд в Великой Отечественной войне", „За трудовую доблесть", „За доблестный труд" у гонар 100-годдзя з дня нараджэння У.І. Леніна, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, значком Міністэрства культуры СССР „За отличную работу". У 1963 г. ёй прысвоена званне заслужанага работніка культуры БССР.

Рашэннем пашыранага пасяджэння мясцкома ад 8 жніўня 1972 г. за доўгую і бездакорную працу ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У.І. Леніна і ў азнаменаванне 50-годдзя з дня яе заснавання Н.Б. Ватацы занесена ў Кнігу Народнай Славы бібліятэкі.